Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

*С. А. Талмачова*

# МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ АГРАРНАЙ ПАЛІТЫКІ САМАДЗЯРЖАЎЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1861–1914 гг.)

*Манаграфія*

Мінск
БДПУ
2019

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ................................................................

Глава 1 ................................................................4

ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ. КРЫНІЦЫ. МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ ................................................................

*1.1. Гістарыяграфія праблемы* ................................................................8

*1.2. Характарыстыка крыніц* ................................................................8

*1.3. Метадалогія даследавання* ................................................................37

Глава 2 ................................................................50

СТВАРЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ МЯСЦОВЫХ ОРГАНАЎ КІРАВАННЯ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ РЭФОРМЫ 1861 г. ................................................................

*2.1. Стварэнне і дзейнасць інстытута міравых пасрэднікаў* ................................................................56

*2.2. Павятовыя з'езды міравых пасрэднікаў* ................................................................56

*2.3. Губернскія па сялянскіх справах прысутнасці* ................................................................110

*2.4. Павятовыя паверачныя камісіі* ................................................................126

Глава 3 ................................................................163

РЭАРГАНІЗАЦЫЯ І ДЗЕЙНАСЦЬ ПА СЯЛЯНСКІХ СПРАВАХ УСТАНОЎ ПАВОДЛЕ ЗАКОНАЎ АД 27 ЧЭРВЕНЯ 1874 г. І 9 ЧЭРВЕНЯ 1886 г. ................................................................

*3.1. Рэфармаванне губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей* ................................................................187

*у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях* ................................................................

*3.2. Стварэнне і дзейнасць павятовых па сялянскіх справах* ................................................................187

*прысутнасцей у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях* ................................................................

*3.3. Павятовыя па чыншавых справах прысутнасці* ................................................................202

Глава 4 ................................................................219

УСТАНОВЫ ПА СЯЛЯНСКІХ СПРАВАХ ПАВОДЛЕ ЗАКОНА АД 12 ЛІПЕНЯ 1889 г. ................................................................

*4.1. Падрыхтоўка ўвядзення закона 12 ліпеня 1889 г. на тэрыторыі* ................................................................230

*Беларусі* ................................................................

*4.2. Утварэнне і дзейнасць інстытута земскіх начальнікаў* ................................................................230

*4.3. Павятовыя з'езды земскіх начальнікаў* ................................................................240

*4.4. Губернскія прысутнасці* ................................................................289

ЗАКЛЮЧЭННЕ ................................................................298

................................................................334

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

# Глава 4
# УСТАНОВЫ ПА СЯЛЯНСКІХ СПРАВАХ ПАВОДЛЕ ЗАКОНА АД *12 ЛІПЕНЯ 1889 г.*

## 4.1. Падрыхтоўка ўвядзення закона ад 12 ліпеня 1889 г. на тэрыторыі Беларусі

Арганізацыя мясцовага кіравання, створанага пасля вызвалення сялян, была недасканалай. Міравыя пасрэднікі, на думку заканадаўцаў, па рэформе 1861 г. павінны былі рэгуляваць пазямельныя адносіны паміж памешчыкамі і іх былымі прыгоннымі, назіраць за сялянскім самакіраваннем і выконваць яшчэ шэраг адміністрацыйных і судовых абавязкаў. Паводле закона ад 27 чэрвеня 1874 г. ва ўнутраных губернях інстытут міравых пасрэднікаў быў ліквідаваны. У Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях названая пасада была скасавана ў 1878 г., калі за дзейнасцю органаў сялянскага самакіравання сталі назіраць неадменныя члены павятовых па сялянскіх справах устаноў, а з 1901 г. – земскія ўчастковыя начальнікі. У Віленскай і Гродзенскай губернях міравыя пасрэднікі дзейнічалі практычна да канца 1903 г.

Дзейнасць павятовых па сялянскіх справах устаноў ужо ў канцы 70-х гг. XIX ст. паказала практычныя недахопы. Так, член Мінскай губернскай прысутнасці А. А. Міхельсон адзначаў, што неадменныя члены мелі толькі права кантролю над валасным і сельскім начальствам і таму былі не ў стане ў поўнай меры ажыццяўляць кантроль над жыхарамі ўсёй тэрыторыі павета. Пры гэтым неадменны член не меў права асабіста ні разбіраць спрэчкі, ні пакараць вінаватага. Пры разборы спрэчак, скаргаў і спраў па нязначных учынках неадменны член накіроўваў справу ў валасны суд, скаргі на валасны суд – у павятовую прысутнасць ці судовыя ўстановы. Неадменны член назіраў толькі за правільнасцю справаводства валасных праўленняў там, дзе не было закончана пазямельнае ўладкаванне, а ў пазямельных спрэчках садзейнічаў дабрачынным пагадненням аб замене зямель і ўгоддзяў[2].

Неабходнасць змянення такога становішча была ўсвядомлена ўрадам яшчэ ў 1880 г., калі ў сувязі з узнятым пытаннем пачаліся сенатарскія рэвізіі. У лістападзе 1881 г. была створана адмысловая камісія пад старшынствам члена Дзяржаўнага савета М. С. Каханава («Каханаўская камісія»). Гэта камісія была закрыта ў маі 1885 г. яшчэ да заканчэння ўскладзенай на яе справы, а далейшая распрацоўка пытання аб пераўладкаванні мясцовага кіравання была перададзена Міністэрству ўнутраных спраў.

Агульны напрамак работ быў ужо вызначаны. Паказальным з'яўляецца пазіцыя сімбірскага дваранства, якое лічыла, што рэарганізацыя органаў мясцо-

---

[1] НГАБ. – Ф. 1595. Воп. 1. Спр. 3345. Л. 156–162.

[2] НГАБ. – Ф. 1595. Воп. 1. Спр. 61. Л. 99–101.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ